# *УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЗАВЯЗКІ*



**13 сакавіка 2024 года ў межах грамадска-адукацыйнага праекта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі – Грамадскай літаратурнай школы адбыліся чарговыя заняткі з доўгатэрміновага цыклу «Мастацкія дэталі. Кампазіцыя твора». Удзельнікі праекта займаліся вывучэннем завязкі (тэма «Кампазіцыя твора. Завязка»).**

Калі пачынаеш разглядаць гэты элемент кампазіцыі тэксту, галоўнае – не зблытаць яго з адным з сумежных элементаў – пралогам або экспазіцыяй. Уласна, у гэтым і заключалася асноўная цяжкасць. Але сумеснымі намаганнямі, здаецца, атрымалася пераадолець і яе. Усё таму, што занятак быў пабудаваны па традыцыйнай трохчастковай схеме (тэорыя / практыка /аналіз) плюс вельмі добразычлівая атмасфера і нефармальны, па-сяброўску іранічны стыль зносін паміж людзьмі.

З тэарэтычнага блока мы даведаліся, у чым асаблівасць завязкі і ці павінна яна быць у самым пачатку. Былі пералічаныя і ахарактарызаваны ўсе пяць відаў завязкі. На фінішы тэарэтычнай прэамбулы літшкола яшчэ раз паспрабавала засвоіць і падсумаваць – чым жа адрозніваюцца пралог, экспазіцыя і завязка. Як высветлілася, асноўнае паміж імі адрозненне – у тым, што пралог і экспазіцыя ў мастацкім тэксце неабавязковыя. Іх можа і не быць, асабліва ў апавяданні. А вось завязка абавязкова павінна быць нават у невялікіх апавяданнях. Без яе сюжэт не зможа раскручвацца, канфлікту няма, героі бяздзейнічаюць. Усё пачынаецца з завязкі!

Сакавіцкую літаратурна-адукацыйную сустрэчу ў гродзенскім офісе Саюза пісьменнікаў Беларусі, як заўсёды, наведалі прадстаўнікі грамадскасці розных пакаленняў. Да членаў СПБ Анатоля Апанасевіча і Дзмітрыя Радзівончыка далучыліся: член СПБ, паэтэса, публіцыст Тамара Мазур; ветэран педагагічнай працы, аматар літаратуры Галіна Садоўская; аматар літаратуры, дзіцячая пісьменніца, паэтэса Вольга Дзіканава; кандыдат у шэрагі СПБ, аўтар сямі кніг, празаік, дзіцячая пісьменніца Ірына Салата; член гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса, празаік Кацярына Калік; аматар літаратуры, паэтэса Соф'я Суддзіна; аматары літаратуры: паэтэса Ірына Полудзень, паэтэса Алена Шаламіцкая, празаік Вольга Клімянкова і дэбютант нашай літшколы, дзяўчына, якая прадставілася Юліяй (пазнаёміла калектыў са сваёй лірыкай).



Што ж, пальму першынства за найбольш яркі ўдзел у практычнай распрацоўцы завязкі сюжэту па праве варта аддаць Тамары Мазур. Тамара Міхайлаўна *(на фота)* падышла да занятку вельмі сур'ёзна і здолела ўразіць



усіх глыбінёй сваіх аўтарскіх задум. Фактычна пісьменніца выношвае ў свядомасці гатовыя сюжэты твораў, якія пры першай жа магчымасці можна прапанаваць аўдыторыі. Такая спроба і адбылася на сакавіцкай сустрэчы. Выступленне Тамары Мазур выклікала эмацыйны рэзананс і палеміку, чым істотна ўзбагаціла змест нашай сумеснай працы. Нагадаем, што ў практычным блоку заняткаў (доўжыцца 30 хвілін) мы не ствараем цэлыя, скончаныя творы, а толькі прыклады тых кампазіцыйных элементаў, якія вывучае літшкола ў кантэксце канкрэтна зададзенай тэмы.

Варта адзначыць і выступленне Алены Шаламіцкай *(на фота)*. Паэтэса, аўтар дэбютнага зборніка «Скандынаўская лірыка» праявіла сябе эксперыментатарам і напісала прыклад завязкі сюжэту ў выглядзе каламбура, гульні слоў, уласцівай эстэтыцы постмадэрну.

У ходзе праверкі атрыманых ведаў удзельнікі заняткаў экспромтам змадэліравалі ўсе існуючыя віды завязкі. І што не можа не радаваць, былі прадэманстраваны прыклады завязкі сюжэту не толькі празаічных твораў, але нават і ў лірыцы, а гэта ў некалькі разоў складаней. Красавіцкі занятак у Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе будзе прысвечаны вывучэнню наступнага, самага доўгага элементу сюжэта – развіцця дзеяння.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На здымках:** занятак з доўгатэрміновага цыкла «Мастацкія дэталі. Кампазіцыя твора» на тэму «Кампазіцыя твора. Завязка» адбыўся ў Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе. Офіс Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Гродне. 13 сакавіка 2024 года.























МАЙ 2024


МАЙ
2024


руская
паэзія



Усе разам. **Фота** Анатоля Апанасевіча

***Гр.Г.Л.Ш.***

***www.pisateli.by***